Казка за казкай



# Стары конь

Казка за казкай

# Стары конь

БЕЛАРУСКАЯ
НАРОДНАЯ
КАЗКА

Апрацоўка А. ЯКІМОВІЧА

Мастак М. БАИРАЧНЫ



Мінск
«Юнацтва»
1987



© Выдавецтва «Юнацтва», 1987.



Быў у аднаго гаспадара стары конь. Цяжка ўжо яму стала саху цягаць, пачаў ён прыставаць. Пашкадаваў гаспадар каня, падкаваў яго сталёвымі падковамі ды пусціў на луг адпасвацца.



Пасецца конь тыдзень, пасецца другі. Паправіўся, нават падбрыкваць пачаў.

Трапіў аднойчы на гэты луг леў. Убачыў каня і здзівіўся: што за звер такі?

— Хто ты будзеш? — пытаецца ён у каня.

— Конь. А ты хто?

— А я леў. Над усімі звярамі цар. Я цябе з'ем.

— Каб з'есці мяне,— кажа конь,— трэба сілу мець...

Стукнуў леў сябе хвастом па баках, зароў:





— Я самы дужы звер!

— Го-го-го! — зарагатаў конь.— Яшчэ паглядзім, хто з нас дужэйшы. Давай сілаю мерацца!

— А як будзем мерацца? — пытаецца леў.

— Бачыш вунь вялікі камень?



— Бачу,— кажа леў.

— Дык вось, хто стукне па гэтым камені так, каб агонь з яго паказаўся, той і дужэйшы.

— Добра,— згадзіўся леў.



Падышоў ён да каменя і пачаў біць лапамі. Біў, біў, толькі кіпцюры паздзіраў, а агню так і не выбіў.

— Гі-г-гі,— смяецца з яго конь.— Слабы ж ты, брат, зусім. А яшчэ царом лічышся. Вось глядзі, як я стукну.

Падышоў стары конь да каменя, стаў да яго



задам, нахмыліўся, падбрыкнуў і смальнуў падковамі аб камень... Іскры з каменя так і пасыпаліся...

«Ого,— падумаў сам сабе леў,— благія жарты з такім зверам».

І, нічога не сказаўшы, пабег у лес. Там сустрэўся яму воўк.



— Добры дзень, ваша царская міласць! — пакланіўся яму воўк.— Куды мелі ласку хадзіць? Што чулі, што бачылі?

— Быў на зялёным лузе,— адказаў леў.— Бачыў там самага дужага звера...



— Якога? — пытаецца воўк.

— Каня.

— Гм...— кажа воўк.— Я іх не толькі бачыў, а і з’еў нямала.



— Што ты выдумляеш!— усхадзіўся леў.— Не можа быць.

— То хадзем, ваша міласць, пабачыще, як я з ім распраўлюся. Падышлі леў з ваўком да лугу.

— Ну, дзе ж той конь? — пытаецца воўк.

— Ды вунь там, за кустамі, ходзіць.



— Не бачу,— кажа воўк.

Узяў леў ваўка пад лапаткі і падняў над сабою:

— Цяпер бачыш?

Маўчыць воўк, як вады ў рот набраўшы.

Паглядзеў на яго леў — а той і не дыхае: задушыў яго цар звяроў сваімі лапамі.

Апусціў леў ваўка на зямлю і кажа:



— Ну вось бачыш: ты толькі зірнуў на яго і то ўжо самлеў. А яшчэ выхваляўся! Што ж было б, каб мы падышлі блізка да гэтага звера: з'еў бы ён і цябе і мяне...

Напалохаўся леў каня ды ўцёк у далёкі край. З таго часу ён і не жыве ў нас.



Сказка за сказкой

СТАРЫЙ КОНЬ

Белорусская народная сказка

Для детей дошкольного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Загадчык рэдакцыі М. А. Казбярук
Адказны за выпуск А. М. Каляда
Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова
Мастацкі рэдактар А. У. Ружо
Тэхнічны рэдактар А. В. Русецкая
Карэктар Л. С. Мануленка
ІБ № 954

Здадзена ў набор 12.05.86. Падпісана да друку 06.12.86. Фармат 70×84 1/16. Папера афс. № 2. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 1,09. Ум. фарб.-адб. 4,91. Ул.-выд. арк. 1,13. Тыраж 90 000 экз. Зак. 970. Цана 10 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. 220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79.

$С\frac{4803010200-022}{307(05)-87}36-87$

ББК 84 Бел 7
С77

10 к.

